МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БДУ

кафедра гісторыі і беларусазнаўства

# АЙЧЫННАЯ ГІСТОРЫЯ

# Прыкладная праграма курса для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў

(праект)

Мінск 1997

Праграма складзена кафедрай гісторыі і беларусазнаўства
Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ

**Аўтарскі калектыў:**

Сташкевіч М.С., д.г.н., прафесар (кіраўнік)
Загарульскі Э.М., д.г.н., прафесар
Галенчанка Г.Я., к.г.н., дацэнт
Емельянаў С.Г., к.г.н., дацэнт
Яфімава В.Ф., метадыст

**Аннотация**

Учебная программа по курсу "Ачынная гісторыя" является проектной версией и разработана в рамках проведения научно-исследовательской работы в РИВШ БГУ по теме "Система гуманитаризации образования в Республике Беларусь". Авторский коллектив будет благодарен за замечания и рекомендации, способствующие совершенствованию структуры и содержания курса.

Ваши отзывы присылайте по адресу:
220001, Минск, Московская, 15
Научно-исследовательский сектор
Телефоны: 222-83-31, 224-84-24



# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Асноўная асаблівасць вывучэння гісторыі Беларусі ў ВНУ вызначаецца тымі абставінамі, што фактычна да 1992—1993 навуч. года яна не з'яўлялася самастойным курсам ў сярэдняй школе, а існавала ў якасці неабавязковага дадатка да "Гісторыі СССР (Расіі)". У выніку шмат пакаленняў, ў тым ліку і сучаснае, добра не ведаюць гісторыі свайго народа, яго культурнай спадчыны.

Сёння выкладчык гісторыі Беларусі апынуўся ў даволі складаным становішчы. У святле сучасных рэалій узнікла неабходнасць у стварэнні і выкладанні прынцыпова новых курсаў айчыннай гісторыі як у сярэдняй школе так і ў ВНУ.

Прадстаўленая праграма курса "Гісторыя Беларусі" разлічана на студэнтаў ВНУ, якія навучаюцца па спецыяльнасцях негістарычнага профілю і дапаможа, на наш погляд, хаця б часткова вырашыць гэтыя праблемы. Таму аўтары праграмы імкнуліся стварыць сваё асаблівае ядро гістарычнай адукацыі, якая таксама ўключае ў сябе адначасова даступны і дастатковы аб'ём ведаў па гісторыі Беларусі, неабходных кожнаму выпускніку ВНУ рэспублікі.

У праграме пададзены погляды і адлюстраваны шматгадовы і даволі разнастайны вопыт вывучэння і выкладання гісторыі Беларусі ад старажытнасці да цяперашняга часу калектывам кафедры гісторыі і беларусазнаўства РІВШ БДУ.

Галоўнай мэтай прапануемага курса з'яўляецца даволі шырокае, грунтоўнае і навукова аб'ектыўнае асвятленне шматвяковай гісторыі Беларусі і выхаванне на яе падставе адукаваных, культурных, свядомых грамадзян суверэннай дзяржавы. Менавіта таму ў аснову гэтай праграмы пакладзена ідэя паступовага і супярэчлівага развіцця чалавечага грамадства, што ў сваю чаргу дазваляе пабудаваць аптымальны варыянт курса гісторыі Беларусі ў спалучэнні цывілізацыйнага падыходу. Тым больш, паколькі цывілізацыя ўключае ў сябе супольнасць матэрыяльных і духоўных дасягненняў чалавека, якія характарызуюцца пэўнымі заканамернасцямі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і духоўнага развіцця, то, зыходзячы з гэтага, можна разглядаць гісторыю Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. Гэты, безумоўна, дапаможа студэнтам лепш усвядоміць месца і ролю Беларусі ў гістарычным працэсе. Прапануемая праграма вызвалена ад ідэалагічных штампаў, якія працяглы час скоўвалі выкладанне гісторыі Беларусі і грунтуецца на храналагічна-праблемным падыходзе, які дазваляе адлюстраваць ў змесце курса разуменне гісторыі як адзінага і непарыўнага працэсу.

Праграма ўключае наступныя элементы гістарычных ведаў: сістэматычныя веды аб сацыяльных, эканамічных, палітычных і культурных працэсах на Беларусі ад старажытнасці да сучаснасці, якія вывучаюцца на багатым і разнастайным фактычным матэрыяле і падаюцца ў кантэксце сусветнай гісторыі з улікам цывілізацыйных характарыстык, гістарычныя пацяцці і светапоглядныя ідэі, даволі падрабязныя звесткі аб гістарычных

дзеячах культуры Беларусі. Асаблівая увага надаецца гісторыі культуры, паколькі аўтары лічаць, што менавіта ў ёй у канцэнтраваным выглядзе адлюстроўваюцца ўсе формы жыцця і дзейнасці чалавека, сацыяльна-эканамічнага і палітычнага ладу краіны.

Прыкладная агульная колькасць гадзін на выкладанне гэтага курса, на нашу думку, 90 гадзін. Размеркаванне часу па асобных тэмах і выбар форм вучэбных заняткаў мэтазгодна ажыццяўляць непасрэдна ў ВНУ, зыходзячы з канкрэтных ўмоў.



**"Гісторыя Беларусі"**

тэматычны план

1. Тлумачальная запіска.
2. Уводзіны.
3. Тэма I. Першабытнаабшчынны лад. Рассяленне на Беларусі славянскіх плямёнаў.
4. Тэма II. Старажытныя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі.
5. Тэма III. Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае (XIII—XVI ст.ст.).
6. Тэма IV. Беларусь у канцы XVI—XVIII ст.ст.: ад Люблінскай уніі да падзелу Рэчы Паспалітай.
7. Тэма V. Беларусь у складзе Расійскай Імперыі ў канцы XVIII — сярэдзіне XIX ст.ст.
8. Тэма VI. Беларусь у другой палове XIX ст. і пачатку XX ст. Барацьба за дэмакратыю і нацыянальнае адраджэнне.
9. Тэма VII. Рэвалюцыя 1917 года. Беларусь у перыяд фарміравання дзяржаўнасці і станаўлення новага укладу жыцця (сакавік 1917 — чэрвень 1941 гг.).
10. Тэма VIII. Заходняя Беларусь у складзе Польскай дзяржавы. Нацыянальна-вызваленчая барацьба.
11. Тэма IX. Беларусь у гады другой сусветнай вайны.
12. Тэма X. Беларусь у гады пасляваеннага аднаўлення і першых спроб рэфармавання савецкага грамадства.
13. Тэма XI. Беларусь у гады стабілізацыі і наспявання крызісу савецкай сістэмы (60—80 гг.).
14. Тэма XII. Беларусь на шляху дзяржаўнай незалежнасці. Утварэнне Рэспублікі Беларусь.
15. Крыніцы і літаратура.

## УВОДЗІНЫ

Значнасць курса. Новыя магчымасці ў распрацоўцы навуковага курса гісторыі Беларусі. Адмаўленне ад схематызму і дагматызму. Насычэнне курса фактамі і асобамі. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. Праблема канцэпцыі гісторыі Беларусі. Магчымасці складання альтэрнатыўных курсаў. Плюралізм меркаванняў ў гістарычных даследаваннях. Выхаваўчае значэнне курса айчыннай гісторыі.

Перыядызацыя. Крыніцы і іх магчымасці (пісьмовыя, лінгвістычныя, археалагічныя, антрапалагічныя, этнаграфічныя). Важнейшыя публікацыі крыніц. Кароткая гісторыяграфія. Ацэнка навейшых даследаванняў па гісторыі Беларусі.

## ТЭМА І. ПЕРШАБЫТНААБШЧЫННЫ ЛАД. РАССЯЛЕННЕ НА БЕЛАРУСІ СЛАВЯНСКІХ ПЛЯМЁНАЎ

Пытанне аб пачатковым засяленні тэрыторыі Беларусі. Ледніковыя перыяды. Найстаражытныя стаянкі палеаліту. Культурна-гістарычныя аналогіі.

Засяленне ў мезаліце і фарміраванне першых вялікіх этнічных супольнасцяў. Вытокі і прычыны рассялення. Характар мезалітычных міграцый. Колькасць мезалітычных стаянак. Змяненне колькасці насельніцтва ў параўнанні з палеалітам. Археалагічныя культуры мезаліту. Этнічныя працэсы ў мезаліце.

Неалітычныя культуры. Іх сувязь з мезалітычнымі. Міграцыі. Панаванне прысвойваючых формаў гаспадаркі. Змяненне ў гаспадарцы неалітычных плямён і рост насельніцтва. Узрастанне ролі рыбалоўства. Найстаражытныя шахты. Мастацтва каменнага веку. Вераванні.

Пытанне аб этнасе ў неаліце. Даныя гідранімікі па гэтаму пытанню. Праблема фіна-угорскага этнасу на Беларусі.

З'яўленне індаеўрапейцаў ва Усходняй Еўропе. Археалагічныя адзнакі індаеўрапейскіх плямёнаў. Далейшая дыферэнцыяцыя індаеўрапейцаў. Міграцыя сярэднееўрапейскіх плямён. Іх узаемадзеянне з мясцовым насельніцтвам. Вынікі этнічных узаемадзеянняў. Прыкметы выцiскання мясцовага насельніцтва. Прыкметы змяшэння. Расцягнутасць у часе працэсу.

Пытанне аб этнасу сярэднедняпроўскіх плямён. Даныя на карысць балтыйскай прыналежнасці прышлых плямён. Іншыя ўяўленні. Дыферэнцыяцыя балтаў і вынікі рассялення.

Змяненні ў занятках насельніцтва і ў грамадскім ладзе. Змена прысвойваючай эканомікі вырабляючай. Распаўсюджванне металу. Зацвярджэнне бацькоўскага ладу. Духоўная культура. Найстаражытныя курганы.



Лакальныя групы гарадзішчаў. Мілаградскія плямёны. Пытанне аб фарміраванні мілаградскай культуры і магчымых міграцыях. Мясцовыя вытокі культурных прыкмет. Праблема этнічнай прыналежнасці мілаградцаў.

Асаблівасці фарміравання культуры штрыхаванай керамікі. Адзнакі мясцовага субстрата. Лакальныя групы плямён штрыхаванай керамікі. Гарадзішча Малышкі. Днепрадзвінскія плямёны. Асаблівасці фарміравання культуры. Фіна-угорскія элементы.

З'яўленне пазнелужыцкіх (падклошавых) плямён. Іх арэал на Беларусі. Адносіны з іншымі плямёнамі. Пытанне аб этнічнай прыналежнасці падклошавых плямён.

Зарубінецкія плямёны. Пытанне аб іх паходжанні. Мясцовыя і нетутэйшыя элементы ў іх культуры. Праблема этнічнай атрыбуцыі зарубінецкіх плямён.

Далейшае рассяленне зарубінецкіх плямён. Іх уплыў на этна-культурную карціну наступных часоў.

Постзарубінецкія плямёны. Іх месца ў этнакультурнай гісторыі Усходняй Еўропы. Банцараўска-тушэмлінскія плямёны. Доўгія курганы і праблема этнічнай атрыбуцыі носьбітаў культуры доўгіх курганоў. Мясцовыя вытокі культуры.

Гаспадарчае жыццё. Культура. Вераванні.

Лакалізацыя славянскай прарадзімы. Пачатак шырокага рассялення славян і іх з'яўленне на тэрыторыі Беларусі. Плямёны пражскай культуры ва Усходняй Еўропе. Корчакская і лука-райкавецкая культуры. Фарміраванне ўсходніх славян. Грамадскі лад у славян.

Палітычная сітуацыя ва Усходняй Еўропе напярэдадні шырокага рассялення ўсходніх славян. Пачатак рассялення славян на поўнач ад Прыпяці. Летапіс аб славянскім рассяленні на Беларусі. Пытанне аб "летапісных плямёнах" усходніх славян. Спробы выдзялення этнічна-вызначальных прыкмет. Аднастайнасць культуры ўсходніх славян на пачатковым этапе рассялення. Сфеычныя курганы з трупаспаленнем. Узаемаадносіны славян з балтыйскім насельніцтвам. Адзнакі этнічных узаемадзеянняў. Вынік змяшэння з балтамі.

Прагрэс у гаспадарцы. Распаўсюджванне больш дасканалых тыпаў сельскагаспадарчых прылад. Грамадскі лад. Тэрытарыяльная абшчына. Паганства. Неславянскія этнасы на тэрыторыі Беларусі.

## ТЭМА ІІ. СТАРАЖЫТНЫЯ ДЗЯРЖАЎНЫЯ УТВАРЭННІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ.

Пачатак Русі. Пашырэнне тэрыторыі Старажытнарускай дзяржавы. Найстаражытныя гарады і княствы на тэрыторыі Беларусі. Рагвалод. Тур. Заходнія землі Русі і Кіеў. Адміністрацыйны падзел і арганізацыя кіравання.

Павіннасці. Зацвярджэнне ў Полацкім княстве дынастыі Ізяславічаў. Страта нашчадкамі Ізяслава права на кіеўскае вялікае княжанне.

Увядзенне хрысціянства і яго значэнне.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходніх земляў Русі. Поспехі ў сельскай гаспадарцы. Сяляне і іх побыт. Формы эксплуатацыі.

Віды феадальнага землеўласніцтва.

Развіццё гарадскага жыцця. Колькасць старажытных гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Знешні від горада. Гарадское рамяство. Гандаль.

Пачатак феадальнай раздробленасці. Прычыны і вынікі. Умацаванне княстваў у заходніх землях Русі. Праблема мясцовай дзяржаўнасці. Узаемаадносіны з Кіевам і іншымі княствамі Русі. Войны 60—70-х гг. XI ст. Бітва на Нямізе. Усяслаў Брачыслававіч. Поспехі полацкіх князёў у Прыбалтыцы.

Удзельны перыяд у гісторыі заходніх земляў Русі. Даныя пісьмовых крыніц аб колькасці ўдзельных княстваў. Дынастычныя сувязі полацкіх князёў і іх удзел у агульнарускіх справах. Міжусобныя войны ў XII ст. Узмацненне баярства. Асноўныя тэндэнцыі ў дзяржаўным ладзе. Веча.

Барацьба з нямецкімі рыцарамі. Аслабленне Полацкага княства ў XIII ст. Заходнія землі Русі і татара-мангольскае нашэсце.

Этнічныя працэсы ў старажытнарускі перыяд. Адзінства інтэграцыйных і раз'яднальных працэсаў. Пытанне аб старажытнарускай народнасці. Прыкметы народнасці. Мова і культура старажытнай Русі. Этнічная самасвядомасць. Саманазва. Прычыны паступовага раздзялення старажытнарускай народнасці. Уплыў этнічных субстратаў на ўсходнеславянскі (старажытнарускі) этнас.

Культура заходніх земляў Русі. Яе адносіны да культуры іншых земляў Русі. Вусная народная творчасць. Гістарычныя сюжэты былін. Волх Усяслававіч. Апавяданне аб Уладзіміру і Рагнедзе.

Пісьменнасць. Распаўсюджванне пісьменнасці. Знаходкі берасцяных грамат. Барысавы і Рагвалодаў камяні. Надпісы на іншых прадметах. Рукапісныя кнігі. Тураўскае евангелле. Еўфрасіння Полацкая. Кірыла Тураўскі. Пытанне аб летапісанні ў заходніх землях Русі. Мастацкія вырабы з металу, каменя, касці. Крыж Лазара Богшы. Скарб з Вічшынскага замка. Фрэскі.

Архітэктура. Узнікненне мясцовых архітэктурных школ. Сафійскі сабор ў Полацку. Мінскі храм. Спаская царква ў Полацку. Благавешчанская царква ў Віцебску. Гродзенскія манументальныя пабудовы. Белая вежа ў Камянцы.

Значэнне старажытнарускага этапа ў гісторыі Беларусі. Заходнія землі Русі ў кантэксце гісторыі старажытнай Русі.



## ТЭМА III. ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ, РУСКАЕ І ЖАМОЙЦКАЕ (XIII—XYI ст.ст.)

Сацыяльна-эканамічныя перадумовы фарміравання ВКЛ. Цэнтраімклівыя тэндэнцыі, што дзейнічалі на землях Беларусі, Літвы, Украіны, некаторых рускіх княстваў, уплыў знешніх фактараў (пагроза мангола-татарскіх нашэсцяў, барацьба з галіцка-валынскімі князямі, ордэнскай і польскай феадальнай экспансіяй і інш. у працэсе ўтварэння Літоўскага княства). Актыўная, шмат у чым вызначальная роля беларускіх феадалаў і іншых слаёў насельніцтва Беларусі, якія непасрэдна ці ўскосна ўдзельнічалі ва ўтварэнні ВКЛ і яго абароне. Высокі грамадска-палітычны, культурны і сацыяльна-эканамічны ўзровень усходнеславянскіх зямель у складзе ВКЛ і яго уплыў на стымуляванне працэса феадалізацыі і дзяржаўнага будаўніцтва ў беларуска-літоўскай дзяржаве. Пытанне пра гістарычную назву "Літва". Эвалюцыя дзяржаўнай назвы ВКЛ. Барацьба за вялікае княжанне пасля смерці Міндоўга. Цэнтралізатарская палітыка вялікіх князёў Віценя, Гедыміна, Альгерда. Дынастычная барацьба ў 70—90-я гг.XIV ст. (Кейстут, Ягайла, Андрэй Полацкі, Вітаўт). Узмацненне вялікакняжацкай улады ў гады княжання Вітаўта. Ліквідацыя ўдзельных княжанняў. Стварэнне ваяводстваў. Гарадзельскі прывілей 1413 г. і яго вынікі. Унутрыпалітычная барацьба пасля грамадзянскай міжусобнай феадальнай вайны 30-х гадоў XV ст. Падзел дзяржавы на Вялікае княства Літоўскае і Вялікае княства Рускае. Вялікакняскія прывілеі 1432, 1434 гг. Аб'яднанне дзяржавы Жыгімонтам Кейстутавічам. Абмежаванне вялікакняжацкай улады ў другой палове XV ст. Унутрапалітычная барацьба ў ВКЛ з канца XV ст. да 1569 г. Змены ва ўнутранай палітыцы вярхоўнай улады. Адмена Гарадзельскага прывілею. Усталяванне рэлігійнай талерантнасці. Заканадаўства ВКЛ. Судзебнік Казіміра 1468 — першы збор законаў беларуска-літоўскай дзяржавы. Статуты 1529 і 1566 гг.

Палітычныя органы дзяржаўнай улады, іх эвалюцыя, функцыі (вярхоўная ўлада, Рада, сеймы, сеймікі, войска і інш.). Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ. Пераемнасць у развіцці дзяржаўна-палітычных форм на Беларусі і уплыў іх на дзяржаўны лад ВКЛ. Своеасаблівасць грамадска-палітычнага становішча Полацкага, Віцебскага і іншых беларускіх і украінскіх зямель (княстваў) у палітычнай сістэме ВКЛ, іх адміністрацыйна-федэратыўныя правы. Узрастанне палітычнай ролі беларускіх і украінскіх феадалаў у палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці з сярэдзіны XV ст. і асабліва з канца XV — першай паловы XVI ст.

Тэндэнцыі кансалідацыі кіраючых колаў беларуска-літоўскай дзяржавы. Павышэнне ролі Рады і Сойму Вялікага княства Літоўскага. Іх склад у XV—XVI ст.ст. Змова супраць Казіміра (1481 г.) і яе вынікі. Вялікакняскі прывілей 1492 г. Палітычныя ўзаемаадносіны ВКЛ з суседнімі дзяржавамі (Польшчай, Тэўтонскім ордэнам, Маскоўскім вялікім княствам, Крымскім ханствам).

Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ. Паходы Альгерда на Маскву. Бітва на Сініх Водах (1362). Далучэнне да ВКЛ украінскіх зямель. Унутраная вайна 30-х гадоў XV ст. Дзяржаўныя уніі з Польшчай (Крэўская, Гарадзельская і інш.). Грунвальдская бітва (1410 г.) і яе значэнне. Войны канца XV — першай трэці XVI ст. Лівонская вайна.

Развіццё царкоўна-рэлігійных адносін. Становішча праваслаўнай царквы, узнікненне каталіцкай (з канца XIV ст.) і рэфармацыйнай царкваў (з сяр. XVI ст.), іх узаемаадносіны, уплыў на беларускае насельніцтва. Царква і рэлігія ў палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці ВКЛ. Функцыі царквы як самакіруючайся спецыфічнай установы ў феадальным грамадстве. Роля царквы і духавенства ў захаванні культурных традыцый, культурнай спадчыны, фарміраванні светапогляду і пабытовых звычаяў насельніцтва. Талерантнасць у заканадаўстве і ў практыцы грамадскага жыцця.

Сацыяльна-эканамічнае жыццё. Феадальнае землеўладанне і гаспадарка. Катэгорыі сялянства, працэс запрыгоньвання. Аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. — "Валочная памера". Выступленні і барацьба супраць узмацнення феадальнага прыгнёту. Гарады Беларусі — цэнтры рамяства і гандлю. Сацыяльна-палітычнае развіццё гарадоў. Фарміраванне саслоўя мяшчан, этна-рэлігійная і колькасная характарыстыка насельніцтва беларускіх гарадоў і мястэчак. Удзел гараджан Беларусі ў грамадска-палітычных руках. Магдэбургскае права і сістэма гарадскога самакіравання. Уладальніцкія гарады. Перараўтварэнне беларускіх гарадоў у рамесна-гандлёвыя цэнтры.

Культура. Духоўная і матэрыяльная культура. Асноўныя канцэпцыі аб паходжанні беларускага этнасу і назвы "Белая Русь". Этнічная тэрыторыя беларусаў у другой палове XIII-XVI ст.ст. Утварэнне сацыяльна-эканамічнай супольнасці. Эканамічныя, палітычныя, прававыя і іншыя фактары, якія садзейнічалі кансалідацыі беларускага этнасу. Насельніцтва Беларусі. Этнічная і дэмаграфічная характарыстыка, міжэтнічныя адносіны.

Умовы развіцця культуры ў беларуска-літоўскай дзяржаве. Эвалюцыя культуры, рамяства, узнікненне новых галін духоўнай і матэрыяльнай дзейнасці насельніцтва. Уплыў сацыяльных, палітычных і эканамічных фактараў на яе развіццё. Народная творчасць. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў ВКЛ. Роля мовы ў фарміраванні і развіцці этнічнай свядомасці беларусаў. Асвета. Літаратура. Кнігадрукаванне. Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Мікола Гусоўскі, Мялецій Смятрыцкі. Статуты ВКЛ (1529, 1566, 1589) — выдатныя помнікі грамадскай думкі. Характэрныя рысы беларускай архітэктуры XIV—XVI ст.ст. Выяўленчае мастацтва. Рэнесанс на Беларусі: сацыяльныя і духоўныя асновы. Рэфармацыйны рух. Контррэфармацыя. Працэс сацыяльнай кансалідацыі прывілеяванага саслоўя ВКЛ на аснове дзяржаўнага патрыятызму.



## ТЭМА IV. БЕЛАРУСЬ У КАНЦЫ XVI—XVIII СТ.СТ.: АД ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ ДА ПАДЗЕЛАЎ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Утварэнне Рэчы Паспалітай, яго змест і значэнне, палітычныя вынікі. Люблінская унія 1569 г. Прычыны рэалізацыі планаў стварэння новага дзяржаўнага фарміравання. Незадаволенасць часткі магнатаў і шляхты ВКЛ умовамі уніі. Распрацоўка і прыняцце Статута 1588 г. Органы ўлады і кіравання. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай і ВКЛ у канцы XVI—XVIII ст.ст. Паступовая паланізацыя сацыяльных вярхоў беларускага грамадства. Сялянска-казацкія выступленні на Беларусі супраць феадальнага ўціску і паланізацыі. Ваенныя дзеянні на Беларусі 1648—1667 гг. Андрусоўскі мір (1667 г.). Барацьба магнацкіх груповак у другой палове XVII — пачатку XVIII ст.ст. Беларусь у гады Паўночнай вайны. Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Спроба рэформы палітычнага ладу. "Дысідэнцкае" пытанне. Тры падзелы Рэчы Паспалітай. Канстытуцыя Рэчы Паспалітай (1791 г.). Паўстанне Касцюшкі.

Стан сялянскай гаспадаркі. Феадальнае землеўладанне. Юрыдычнае і эканамічнае становішча сялян. Павіннасці і дзяржаўныя паборы. Супраціўленне сялян узмацненню феадальнага прыгнёту. Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам В.Вашчылы (1740—1744 гг). Гарады Беларусі. Рамесная вытворчасць і гарадскі гандаль. Гандлёвыя сувязі. Самакіраванне. Сацыяльная барацьба ў беларускіх гарадах.

Этнічная тэрыторыя і этнічная структура беларускага народа. Яго этнічная самасвядомасць. Рэлігійныя адносіны у ВКЛ (XVII—XVIII ст.ст.). Ускладненне царкоўна-рэлігійных адносін (Берасцейская унія 1596 г.). Негатыўныя тэндэнцыі ў духоўным жыцці беларусаў, рэлігійная канверсія. Узмацненне пазіцый каталіцкай царквы. Устварэнне уніяцкай царквы ў XVII — пачатку XVIII ст.ст. Пашырэнне уніяцтва сярод сельскага насельніцтва і мяшчанства. Сялянства як захавальнік патэнцыялу для развіцця беларускага этнасу.

Этапы асветніцтва на Беларусі. Паланізацыйныя тэндэнцыі ў культурным развіцці Беларусі. Стан асветы. Кнігадрукаванне. Літаратура. Школьная справа. Грамадска-палітычная і філасофская думка. Калегіі, царкоўныя брацтвы на Беларусі. Фальклорызацыя беларускай культуры. Развіццё вуснай народнай творчасці. Музыка. Тэатр. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура.

## ТЭМА V. БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ У КАНЦЫ XVIII—СЯРЭДЗІНЕ XIX СТ.СТ.

Характар і галоўныя напрамкі палітыкі царызму ў Беларусі. Тэрытарыяльна-адміністратыўны падзел Беларусі і стварэнне новай адміністрацыі. Органы кіравання і суд. Падаткі і павіннасці. Адносіны да уніяцкай і каталіцкай канфесій. Праваслаўная царква. Усталяванне "мяжы яўрэйскай аседласці". Праект аднаўлення Вялікага княства Літоўскага.

Вайна 1812 г. і Беларусь. Палітыка французскай акупацыйнай улады. Часовая ўрадавая камісія Вялікага княства Літоўскага і яе дзейнасць.

Грамадска-палітычныя працэсы на Беларусі ў 20—30-я гады. Тайныя таварыствы. Дзекабрысты на Беларусі. Паўстанне 1830—1831 гг. і яго ўздзеянне на развіццё грамадска-палітычнага руху.

Новыя напрамкі ў палітыцы самаўладдзя. Курс на русіфікацыю Беларусі. "Асобны камітэт па справах заходніх губерній" і яго дзейнасць па насаджэнню рускага землеўладання і чыноўніцтва. Ліквідацыя уніяцкай царквы. Адмена дзеяння на Беларусі Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Увядзенне расійскага заканадаўства і яго роля ў паскарэнні русіфікацыі Беларусі. Забарона назвы "Беларусь" у афіцыйнай дакументацыі. Грамадска-палітычны рух у 40—50-я гады. Зараджэнне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Колькасны, саслоўны і нацыянальна-канфесійны склад насельніцтва Беларусі. Асаблівасці сацыяльнага развіцця беларускіх земляў. Стан памешчыцкай гаспадаркі. Асноўныя напрамкі спецыялізацыі сельскай гаспадаркі. Паглыбленне сацыяльнай дыферэнцыяцыі сялян.

Разлажэнне цэхавой сістэмы. Вотчынная і гарадская прамысловасць. Рост мануфактур і з'яўленне першых фабрык. Роля гарадоў у развіцці прамысловасці. Органы гарадскога самакіравання.

Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Антыпрыгонніцкі сялянскі рух. Першыя парасткі буржуазнага ўкладу. Спробы ажыццяўлення рэформ гаспадаркі, прамысловасці.

Культура на Беларусі. Стан народнай адукацыі і навукі. Тыпы школ і іх колькасць. Полацкая езуіцкая акадэмія. Роля Віленскага універсітэта як значнага цэнтра адукацыі і навукі. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Эвалюцыя сістэмы народнай адукацыі ў 30—50-я гады. Пачатак этнаграфічных і гістарычных даследаванняў. Змест беларускага фальклору. Творы мастацкай літаратуры. П.Багрым. Ананімныя паэмы "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе". Беларускія матывы ў творчасці А.Міцкевіча. Беларуская плынь у польскамоўнай мясцовай літаратуры. Я.Чачот, Я.Баршчэўскі, А.Рыпінскі. В.Дунін-Марцынкевіч. Ул.Сыракомля, А.Кіркор. Тэатр і музыка. С.Манюшка і яго опера "Сялянка". Выяўленчае мастацтва. У.Аляшкевіч. Я.Данель., В.Ванькович, У.Хруцкі. Архітэктура. Праявы беларускай



нацыянальнай ідэі ў мастацкіх творах, гістарычных і этнаграфічных даследаваннях.

## ТЭМА VI.БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ. І ПАЧАТКУ XX СТ. БАРАЦЬБА ЗА ДЭМАКРАТЫЮ І НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АДРАДЖЭННЕ

Буржуазныя рэформы 60—80-х гг., іх роля ў сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці Беларусі. Падрыхтоўка да адмены прыгоннага права на Беларусі. Правы сялян пасля адмены прыгоннага права. Умовы надзялення іх зямлёй. Рэформы аграрных адносін дзяржаўных сялян і іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Вынікі аграрнай рэформы на Беларусі.

Рэформы кіравання і суда. Школьная і цэнзурная рэформы. Васнная рэформа. Прычыны абмежаванасці рэформ і іх незавершанасці.

Стан сельскай гаспадаркі пасля адмены прыгоннага права. Цяжкасці перабудовы гаспадаркі на капіталістычны лад. Феадальна-прыгонныя рэшткі ў сельскай гаспадарцы. Сістэма адработак. Дваранскае землеўладанне і рост безсаслоўнай зямельнай уласнасці. Два шляхі развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі. Змяненні ў сацыяльнай структуры сялян. Характарыстыка асноўных сацыяльных груп сялян. Аграрная перанаселенасць.

Асаблівасці развіцця эканомікі. Стан прамысловасці і яе асноўныя галіны. Замаруджаныя тэмпы пераходу да машыннай вытворчасці. Грашовая рэформа С.Ю.Вітэ і яе вынікі на Беларусі. Узнікненне банкаў і развіццё гандлю. Эканамічная характарыстыка гарадоў. Фарміраванне рабочага класу і буржуазіі. Нацыянальны склад буржуазіі і пралетарыяту.

Сялянскі рух пасля адмены прыгоннага права. Паўстанне 1863 г. на Беларусі. Польскі паўстанчаскі рух і імкненні сялян. Роля рэвалюцыйных дэмакратаў і шляхецкіх рэвалюцыянераў ў паўстанні. К.Каліноўскі — кіраўнік рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні. "Мужыцкая праўда". Два напрамкі ў кіраўніцтве паўстаннем: "чырвоныя" і "белыя". Асаблівасці паўстання ва Усходняй і Заходняй Беларусі. Падаўленне паўстання. Яго вынікі і значэнне.

Формы і дынаміка сялянскага руху і барацьба рабочых у 70—90-х гадах. Народніцкі рух: фарміраванне, ідэалогія, сутнасць. Ідэйныя напрамкі народніцтва. Адлюстраванне беларускай нацыянальнай ідэі ў ідэалогіі народнікаў. Прапаганда беларускімі народнікамі ідэі нацыянальнага адраджэння. Часопіс "Гоман". Пачатак прапаганды марксізму на Беларусі. Першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі. Стварэнне Бунда. Палітычныя выступленні рабочых. Народніцкія гурткі як перадумова фарміравання новых аб'яднанняў грамадска-палітычных плыняў беларускай арыентацыі.

Асноўныя тэндэнцыі далейшага развіцця беларускага этнасу. Аб'ектыўныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя

беларусаў і тэрытарыяльна-адміністратыўныя падзелы другой паловы XIX — пачатку XX ст. Нацыянальны, сацыяльны і рэлігійны склад насельніцтва Беларусі. Паступовы распад саслоўнай структуры. Роля і месца беларускай буржуазіі, пралетарыяту і сялянства у нацыянальным руху.

Перадумовы і пачатак беларускага нацыянальнага адраджэння. Вытокі духоўнага абуджэння народа. Нацыянальна-культурны рух і яго асаблівасці. Студэнцкія культурна-асветніцкія арганізацыі ў Пецярбургу, Маскве. Асвета. Развіццё беларускай літаратурнай мовы. Мастацкая літаратура. Выяўленчае мастацтва, архітэктура, тэатр. Этнаграфічныя і гістарычныя даследаванні. Міжнацыянальныя культурныя сувязі.

Грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст. Утварэнне палітычных партый і арганізацый. Беларуская сацыялістычная грамада: яе ідэалогія, праграма і дзейнасць.

Рэвалюцыя 1905—1907 гг. на Беларусі. Палітычныя выступленні і эканамічная барацьба рабочых. Сялянскі рух. Салдацкія выступленні. Уздым нацыянальнага руху. Тры палітычных лагеры: рэвалюцыйна-дэмакратычныя, ліберальныя і ўрадавыя партыі на Беларусі. Пачатак расійскага парламентарызму і адносіны да яго палітычных сіл Беларусі. Маніфест 17 кастрычніка і пазіцыі розных класаў і партый. Кастрычніцкая палітычная стачка на Беларусі. Снежаньская палітычная стачка на Беларусі. Ход выбараў на Беларусі ў I і II Дзяржаўныя думы і іх вынікі. Паражэнне рэвалюцыі і вяртанне да кансэрватызму. Змены ў тактыцы рэвалюцыйна-дэмакратычных .буржуазна-ліберальных і ўрадавых партый. Левы блок. Дзейнасць БСГ. Пазіцыя "Нашай Нівы". Паражэнне рэвалюцыі. Вынікі трэццечэрвеньскага дзяржаўнага перавароту. Галоўныя напрамкі барацьбы за беларускае нацыянальна-культурнае адраджэнне. "Наша Ніва" — цэнтр адраджэнцкага руху. Яе роля ў развіцці нацыянальнай літаратуры, друку, фарміраванні і згуртаванні нацыянальнай інтэлігенцыі. Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму на Беларусі. Афіцыйныя культурна-асветніцкія арганізацыі ("Белорусское общество" і інш.). Урадавыя арганізацыі ў барацьбе супраць нацыянальнага адраджэння. Ідэалогія і практыка "западнорусизма".

Сталыпінская палітыка "абнаўлення" дзяржавы і яе вынікі на Беларусі. Сацыяльна-эканамічныя працэсы. Сацыяльная структура насельніцтва Беларусі. Асаблівасці прамысловага развіцця Беларусі: высокая ўдзельная вага дробнакапіталістычнай і рамесна-саматужнай вытворчасці, пераважнае размяшчэнне прадпрыемстваў фабрычна-заводскага і мануфактурнага тыпу ў сельскай мясцовасці, адсутнасць буйных прамысловых цэнтраў. Рост акцыянернага капіталу і канцэнтрацыя вытворчасці.

Стан сельскай гаспадаркі. Дваранскае і надзельнае сялянскае землеўладанне як аснова феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў і галоўны тормаз прагрэсіўнага развіцця беларускага грамадства. Вынікі сталыпінскай рэформы ў Беларусі. Грамадскае жыццё. Увядзенне земстваў. Трэццечэрвеньская палітычная сістэма і яе асаблівасці на Беларусі. Аслабленне рэвалюцыйных партый. 1912—1914 гг: палітычны застой і сацыяльнае бражэнне. Стан эканамічнага жыцця. Пачатак вайны. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў гады першай сусветнай вайны. Раскол апазіцыйнага руху. Беларускі грамадска-палітычны рух. Тактыка ліберальных і сацыялістычных партый у гады вайны.



Лютаўская рэвалюцыя. Звяржэнне царызму і асаблівасці "двоеўладдзя" ці "шматуладдзя" на Беларусі. Заходні фронт як важны фактар паскарэння развіцця рэвалюцыі на Беларусі. Расстаноўка палітычных і класавых сіл. Беларускі палітычны рух і яго праграма.

Культура Беларусі ў пачатку XX ст. Асвета і навука. Літаратура і мастацтва. Развіццё перыядычнага друку і кнігадрукавання. Якасныя зрухі ў беларускай мастацкай літаратуры. Роля Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, З.Бядулі, К.Каганца і іншых пісьменнікаў і паэтаў у нацыянальна-культурным адраджэнні. Выяўленчае мастацтва. Тэатр.

## ТЭМА VII. РЭВАЛЮЦЫЯ 1917 ГОДА. БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ, СТАНАЎЛЕННЯ НОВАГА УКЛАДУ ЖЫЦЦЯ (САКАВІК 1917—ЧЭРВЕНЬ 1941 ГГ.)

Барацьба за выбар шляхоў грамадскага развіцця. Падыходы розных палітычных партый да вырашэння дэмакратычных, палітычных і сацыяльных, эканамічных задач на Беларусі, аграрнага і нацыянальнага пытанняў. Палітычныя вынікі праваду наступлення рускай арміі на фронце. Узмацненне процістаяння грамадска-палітычных сіл. Чэрвеньскі і ліпеньскі палітычныя крызісы. Ліпеньскі з'езд прадстаўнікоў беларускіх грамадска-палітычных арганізацый. Абранне цэнтральнай рады: праблемы адзінства дзеяння беларускіх палітычных сіл. Барацьба за нацыянальна-тэрытарыяльную аўтаномію Беларусі ў межах Расійскай дзяржавы.

Працэс бальшэвізацыі Саветаў. Нарастанне рэвалюцыйнага крызісу: узмацненне сацыяльнай напружанасці і нестабільнасці. Дэмакратычныя і нацыянальна-дэмакратычныя партыі ў пошуку мер па выхаду з крызісу. Іх палітычная эвалюцыя. Заходні фронт у стратэгічных мэтах палітычных партый. Асаблівасці крызісу дэмакратыі на Беларусі. Узмацненне тэндэнцый рэвалюцыйнага экстрэмізму ў тактыцы бальшавікоў. Тактыка ліберальных і дэмакратычных партый. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Заходні фронт — апора бальшавікоў у барацьбе за ўладу.

Кастрычніцкая рэвалюцыя. Устанаўленне Савецкай улады на Беларусі. Дзейнасць беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый у ходзе ўстанаўлення Савецкай улады на Беларусі і на Заходнім фронце. Вынікі выбараў на Ўсерасійскі Ўстаноўчы сход на тэрыторыі Беларусі.

Фарміраванне савецкіх органаў улады на месцах на аснове двупартыйнасці — бальшавікоў і левых эсераў. Фарміраванне СНК Заходняй вобласці і фронту. Усебеларускі з'езд у снежні 1917 г. Праблема улады і беларускай дзяржаўнасці. Губернскія, павятовыя і валасныя з'езды Саветаў і іх рашэнні. Курс бальшавікоў на падаўленне палітычнай апазіцыі. Мяцеж польскіх легіянераў.

Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Рабочы кантроль: сутнасць, мэты і паступовае ўвядзенне. Асаблівасці здзяйснення на Беларусі Дэкрэту аб нацыяналізацыі прамысловасці. Утапічнасць уяўленняў аб шляхах сацыялістычнага будаўніцтва. Меры по вырашэнні аграрнага пытання. Узаемаадносіны новай улады з сялянствам. Першыя крокі па ажыццяўленні "Асноўнага закону аб сацыялізацыі зямлі" на Беларусі.

Наступ нямецкіх войскаў і захоп новых тэрыторый Беларусі. Усталяванне акупацыйнага рэжыму. Партызанскі рух. Дзейнасць Выканкома Ўсебеларускага з'езду. Абвяшчэнне І і ІІ Устаўных грамат. Рэарганізацыя Выканкама ў Раду БНР. Прыняцце ІІІ Устаўной граматы аб незалежнасці БНР. Барацьба беларускіх грамадска-палітычных сіл за прызнанне БНР як суверэннай, незалежнай дзяржавы. Знешнепалітычныя арыентацыі Рады БНР. Распад БСГ і фарміраванне новых нацыянальна-дэмакратычных партый. Узаемаадносіны гэтых партый з бальшавікамі. Палітыка бальшавікоў на савецкай тэрыторыі Беларусі. Левазсэраўскі мяцеж у Маскве 6 ліпеня 1918 г. і яго уплыў на палярызацыю палітычных сіл на Беларусі. Складванне сістэмы "ваеннага камунізму".

Заканчэнне нямецкай акупацыі. Палітычныя перадумовы абвяшчання БССР. Роля нацыянальнага камісарыяту пры Наркамаце па справах нацыянальнасцяў РСФСР (Белнацкам) і Беларускіх секцый РКП(б). І з'езд КП(б)Б і яго рашэнні. Маніфест Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўраду Беларусі аб стварэнні БССР. І з'езд Саветаў БССР і яго рашэнні. Першая Канстытуцыя БССР, юрыдычныя прынцыпы "класавай дэмакратыі". Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел). Значэнне рашэнняў VIII з'езда РКП(б) для ўмацавання партыйна-дзяржаўнай дыктатуры ў Літоўска-Беларускай ССР. Пазіцыі партыйных і савецкіх органаў у аграрным і нацыянальным пытаннях.

Польская інтэрвенцыя. Ўзброенае супраціўленне беларускага народа. Спробы беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый аднавіць на акупаванай тэрыторыі Беларусі ўладу БНР. Палітыка польскага ўраду ў дачыненні да БНР. Раскол беларускага грамадска-палітычнага руху. Палітычныя пазіцыі А.І.Луцкевіча і В.Ю.Ластоўскага. Беларускія эсеры як "трэцяя сіла" у грамадзянскай вайне. Іх стаўка на падтрымку працоўнага народу ў рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці. В.Ю.Ластоўскі. Пагадненне паміж беларускімі эсерамі і камуністамі аб сумеснай барацьбе з польскімі інтэрвентамі. Беларускі паўстанцы камітэт як палітычны цэнтр кансалідацыі грамадска-палітычных сіл у барацьбе з польскімі інтэрвентамі. Беларуская камуністычная арганізацыя (БКА). У.М.Ігнатоўскі.



Савецка-польская вайна. Ю.Пілсудскі і яго палітыка ў адносінах да адраджэння беларускай дзяржаўнасці. Тактыка савецкага ўраду ў беларускім нацыянальным пытанні. Аднаўленне Савецкай улады і яе прызнанне беларускімі эсэрамі, Бундам і іншымі нацыянальна-дэмакратычнымі партыямі сацыялістычнай арыентацыі. Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (31 ліпеня 1920 г.). Слуцкае паўстанне. Заключэнне мірнага дагавору з Польшчай. Падзел Беларусі. ІІ Усебеларускі з'езд Саветаў. Умацаванне манаполіі КП(б) на ўладу.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 20-я гады. Новая эканамічная палітыка. Крызіс палітыкі "ваеннага камунізму". Асаблівасці палітычнай абстаноўкі на Беларусі.

Праявы незадаволенасці сялян, іх патрабаванні поўных правоў на зямлю. Абвастрэнне гаспадарчага крызісу. Пашырэнне межаў БССР. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа.

НЭП у рэспубліцы: новая тактыка, ці новая стратэгія? Супярэчнасць паміж новай эканамічнай палітыкай і канцэпцыяй беставарнага сацыялізму. Дыскусія аб прафсаюзах. Фармаванне нэпманаўскай буржуазіі. Кааперацыя і перашкоды яе развіцця. НЭП у прамысловасці. Аграрная палітыка. Зямельны кодэкс БССР (люты 1925 г.) і юрыдычнае замацаванне свабоднага выбару сялянамі форм землекарыстання. План развіцця сельскай і лясной гаспадаркі БССР на 1925—26 — 1929—30 гг. Прычыны зрыву рэалізацыі гэтага плану. Вынікі НЭПу. Перадумовы згортвання НЭПу.

Культура Савецкай Беларусі. Праблемы адукацыі і ліквідацыі непісьменнасці. Першыя крокі Рады БНР па стварэнні беларускіх агульнаадукацыйных школ. Настаўніцкія інстытуты. Курсы беларусазнаўства. Падыход Савецкай улады да школы як "прылады дыктатуры пралетарыяту". Адносіны беларускай інтэлігенцыі да Савецкай улады. Янка Купала і Якуб Колас (заснавальнікі беларускага нацыянальнага і культурнага адраджэння). М.Шагал, К.Малевіч, Ю.Пэн. Адметныя рысы масавай грамадскай свядомасці ў 1917—1920 гг.

Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё рэспублікі. Палітыка беларусізацыі 20-х гадоў. Тэндэнцыі да дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ва ўмовах НЭПу. Ажыўленне работы Саветаў. Амністыя членаў палітычнага апазіцыйнага руху. Вяртанне ў БССР эмігрантаў - дзеячоў беларускай культуры. Праявы ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі дзвюх тэндэнцый (адміністрацыйна-бюракратычнай і нацыянальна-дэмакратычнай). Узмацненне манаполіі КП(б)Б на ўладу. Падаўленне КП(б)Б палітычнай апазіцыі. Роспуск Бунда, БПС-Р, ЯКП ("Паалей-Цыён"), эсэраў і меньшавікоў. Барацьба фракцый ў рамках КП(б)Б.

Палітыка беларусізацыі. Развіццё культуры. Праблемы каранізацыі партыйнага і савецкага апарату: станоўчы вопыт, супярэчнасці, памылкі. Здзяйсненне мерапрыемстваў па развіццю беларускай мовы, літаратуры і мастацтва. Барацьба ў КП(б)Б і дзяржаўных органах па пытаннях іх здзяйснення. Інстытут беларускай літаратуры. У.М.Ігнатоўскі, Д.Ф.Жылуновіч, В.І.Пічэта. Літаратурныя аб'яднанні. Новыя накірункі ў мастацтве. В.Галубок, Е.Міровіч, Н.Сакалоўскі, Ю.Тарыч, М.Філіповіч і інш. Узмацненне адміністрацыйна-партыйнага дыктату ў ходзе нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Згортванне беларусізацыі. Палітыка КП(б)Б у адносінах да рэлігіі і царквы.

Удзел БССР у стварэнні Саюза ССР. Шляхі вырашэння нацыянальнага пытання. Пагадненні паміж БССР і РСФСР і іншымі рэспублікамі. IV Усебеларускі з'езд Саветаў і яго рашэнні. Удзел дэлегацыі БССР у заканадаўчым афармленні Саюза ССР. А.Г.Чарвякоў, У.М.Ігнатоўскі, А.Г.Гетнер, П.Д.Малаковіч, А.С.Славінскі, А.І.Хацкевіч, Д.С.Чарнушэвіч і інш. Дагавор аб стварэнні СССР, аб правах саюзных рэспублік. I Усебеларускі з'езд Саветаў. Канстытуцыя БССР 1927 г.

Беларускае замежжа. Цэнтры беларускай эміграцыі. Палітычныя погляды беларускіх эмігрантаў і палітычная барацьба ў эміграцыі. Рашэнне канферэнцыі прадстаўнікоў ураду і Рады БНР аб яе самароспуску і прызнанні БССР нацыянальнай дзяржавай беларускага народа (Берлін, кастрычнік 1925 г.). Рух за вяртанне на Беларусь.

Курс на індустрыялізацыю. Барацьба за выбар шляхоў. Асаблівасці індустрыялізацыі. Першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі БССР. Прамысловае будаўніцтва. Выкарыстанне экстэнсіўных метадаў гаспадарання. Другая пяцігодка і яе вынікі. Індустрыялізацыя ў гады трэцяй пяцігодкі. Адзяржаўліванне прамысловасці і адсутнасць развітых рыначных адносінаў. Сацыяльна-эканамічны тупік. Сталінская мабілізацыйная эканоміка.

Ідэалагічная падрыхтоўка калектывізацыі на Беларусі. Сталінскі варыянт калектывізацыі сялянскай гаспадаркі. Наступ на вёску (забарона гандлю хлебам, адмова ад палітыкі рассялення і інш.). Разгром прыхільнікаў М.І.Бухарына ў БССР. Д.Ф.Прышчэпаў. Формы сялянскага супраціўлення. Сталінскія лозунгі "суцэльнай калектывізацыі" і "ліквідацыі кулацтва як класа". "Год вялікага пералому" (1929). 1930 г.: новы наступ на вёску. Завяршэнне калектывізацыі і трагедыя рассяляньвання і насаджэння метадаў прымусу ў вёсцы. Вынікі калектывізацыі. Адчужэнне сялян ад сродкаў вытворчасці.

Адміністратыўна-бюракратычнае кіраўніцтва гаспадаркай. Канцэнтрацыя заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады ў дзяржаўна-партыйным апараце. Сталінскія чысткі дзяржаўных установаў. Аднаўленне складу Саветаў, партыйных і грамадскіх арганізацый працоўных. Канстытуцыя Беларускай ССР 1937 г. Палітычныя працэсы. Масавыя рэпрэсіі як інструмент таталітарнага рэжыму.



Справа так званага "Саюза вызвалення Беларусі" (СВБ). Падаўленне нацыянальнай інтэлігенцыі. Зрыў беларусізацыі. Палітыка ўраду рэспублікі ў сферы культуры. Рэформа беларускага правапісу. Вышэйшая школа: арыентацыя на спецнабор з сялянскага і рабочага асяроддзя. Рэарганізацыя інстытута беларускай культуры ў Беларускую Акадэмію навук. Асноўныя напрамкі развіцця навукі ў рэспубліцы. Укараненне дагматызму ў грамадскіх навуках. Рэпрэсіўныя меры супраць першага прэзідэнта БАН У.М.Ігнатоўскага.

Перабудовы па сталінскаму шаблону літаратурна-мастацкіх арганізацый у рэспубліцы. Першы з'езд пісьменнікаў БССР. Абвяшчэнне сацыялістычнага рэалізму адзіным мастацкім метадам. Яго негатыўныя наступствы ў мастацкай літаратуры. Творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, З.Бядулі, Ц.Гартнага, М.Гарэцкага, М.Лынькова, К.Чорнага і інш. Тэатральнае і музычнае мастацтва. Кінематограф. Культурна-асветніцкая праца. Беларуская народная творчасць.

Фенамен канца 30-х гадоў: ацэнка культурнай рэвалюцыі. Усталяванне ідэалагічнай артадоксіі.

## ТЭМА VIII. ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ. НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ

Рыжскі мірны дагавор за ўключэнне заходне-беларускіх зямель у склад польскай дзяржавы. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча Заходняй Беларусі. Палітыка польскага ўраду на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Стан прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Асадніцтва. Становішча працоўных мас. Расклад палітычных сіл. Беларускія нацыянальныя партыі і арганізацыі. Беларускі нацыянальны камітэт. А.І.Луцкевіч. Стварэнне Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Партызанскі рух. Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА). Утварэнне Беларускай сялянска-рабочай грамады (БСРГ) і барацьба за вызваленне Заходняй Беларусі. Разгром БСРГ. Выбары ў Сейм. Стварэнне пасольскага клубу "Змаганне". Б.А.Тарашкевіч. Таварыства беларускай школы (ТБШ). Рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух у канцы 20-х і 30-я гады. Праблема стварэння адзінага антыфашысцкага народнага фронту за мір і дэмакратыю. Трагедыя рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Рэпрэсіўныя меры сталінскага кіраўніцтва. Роспуск КПЗБ.

Аб'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Тэрытарыяльная і этнічная кансалідацыя беларускага народа ў межах БССР. Палітычныя перадумовы ўключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР. Савецка-германскі дагавор. Сакрэтныя пратаколы СССР і Германіі. Агрэсія фашысцкай Германіі супраць Польшчы. Наступ савецкіх войскаў на тэрыторыю Заходняй Беларусі.

Народны Сход Заходняй Беларусі і яго рашэнні. Заканадаўчыя акты аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза ССР і БССР. Палітычныя і сацыяльна эканамічныя пераўтварэнні. Іх супярэчлівасць Зацвярджэнне каманда-адміністрацыйных метадаў кіраўніцтва ва ўсіх сферах жыцця.

## ТЭМА IX. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Напярэдадні нападу фашысцкай Германіі. Супярэчнасці ў сацыяльна-эканамічным, палітычным і духоўным жыцці ў рэспубліцы (канец 30-х гадоў). Удзел Беларусі ў мерапрыемствах па ўмацаванню абараназдольнасці ССР.

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Напад Германіі на Савецкі Саюз. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі ў ліпені—жніўні 1941 г. Брэсцкая крэпасць. Баі пад Мінскам, Магілёвам, Гомелем. Народнае апалчэнне. Эвакуацыя прамысловасці. Акупацыя Беларусі войскамі фашысцкай Германіі. Акупацыйны рэжым. Расчляненне Беларусі на часткі. Калабарацыянізм. Беларуская Цэнтральная Рада (БЦР). Рэалізацыя плана "Ост". Палітыка генацыду. Дзейнасць АК і АУН на Беларусі.

Узнікненне легальных беларускіх палітычных арганізацый. Іх дзейнасць і палітычная арыентацыя.

Разгортванне народнай барацьбы супраць акупантаў. Першыя падпольныя камітэты КП(б)Б і партызанскія атрады. Мінскае падполле. Падпольныя арганізацыі ў другіх гарадах і сельскай мясцовасці. Антыфашысцкія патрыятычныя арганізацыі ў заходніх абласцях рэспублікі. Супраціўлене ў гета. Далейшы ўздым барацьбы ў тыле ворага (баявыя дзеянні партызан, развіццё падполля (рост падпольных арганізацый і груп. Стварэнне Беларускага штабу партызанскага руху (БШПР). Партызанскія зоны. Масавы ўдзел насельніцтва ў зрыве палітычных, эканамічных і ваенных мерапрыемстваў акупантаў. Аперацыя "Котбус". "Рэйкавая вайна". Пачатак вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў у 1943 г. Карэнны перелом у вайне. Аперацыя "Баграціён" у чэрвені—ліпені 1944 г. Беларуская дапамога партызан савецкім войскам. Вызваленне Беларусі.

## ТЭМА X. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПАСЛЯВАЕННАГА АДНАЎЛЕННЯ І ПЕРШЫХ СПРОБ РЭФАРМАВАННЯ САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА

Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі. Рост прамысловасці. Стварэнне новых яе галін: аўтамабільнай, трактарнай, будаўнічай, электроннай, хімічнай і інш. Становішча ў сельскай гаспадарцы. Прымусовая калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР.

Асноўныя тэндэнцыі эканамічнага развіцця рэспублікі. Рост рабочага класа. Змяненні сацыяльнай структуры грамадства за пасляваеннае дваццацігоддзе. Рост гарадскога насельніцтва.

Грамадска-палітычнае жыццё ў пасляваенныя гады. Парушэнні законнасці і правапарадку ў рэспубліцы. Рэпрэсіі ў канцы 40-х (пачатку 50-х гадоў. Высяленне ва

ўсходнія раёны СССР часткі сельскага насельніцтва заходніх вобласцяў БССР. Беларусь у другой палове 50-х—сярэдзіне 60-х гадоў: ад рэформ да рэанімацыі сталінскай сістэмы. Набліжэнне крызісу. Змены ў грамадскім жыцці рэспублікі пасля смерці Сталіна. XX з'езд КПСС: працэсы дэмакратызацыі ў рэспубліцы. Першыя парасткі дэмакратызацыі ў сферах дзяржаўнага і грамадскага жыцця. Непаслядоўнасць і супярэчлівасць ва ўнутранай палітыцы партыйных і дзяржаўных органаў. Асноўныя вынікі палітычнага развіцця рэспублікі.

Удзел Беларусі ў стварэнні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). Эканамічныя і культурныя сувязі Беларусі з замежнымі краінамі.

Культурнае жыццё рэспублікі. Мастацкая літаратура. Мастацтва. Народная адукацыя. Навука.



## ТЭМА XI. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ СТАБІЛІЗАЦЫІ І НАСПЯВАННЯ КРЫЗІСА САВЕЦКАЙ СІСТЭМЫ (60—80 ГГ.)

Спробы правядзення ў другой палове 60-х гадоў эканамічнай рэформы. Тэмпы і напрамкі развіцця вядучых галін прамысловасці рэспублікі. Развіццё тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі і спроба пераводу сельскай гаспадаркі рэспублікі на інтэнсіўнае развіццё. Адыход ад планаў рэформы і далейшае ўмацаванне цэнтралізаванай каманднай сістэмы кіравання эканомікай. Узмацненне адміністрацыйнага дыктату. Прычыны зніжэння тэмпаў росту прамысловай вытворчасці ў канцы 70-х—пачатку 80-х гадоў. Новыя спробы рэарганізацыі кіравання сельскай гаспадаркай ў пачатку 80-х гадоў. Узрастанне застойных з'яў у эканоміцы і сацыяльнай сферы. Астаткавы прынцып у сацыяльнай сферы. Узмацненне супярэчнасцяў у сацыяльна-класавай структуры грамадства.

Узмацненне бюракратызацыі дзяржаўнага механізму. Функцыі Саветаў і іх поўная залежнасць ад улады партыйнага апарата. Узрастанне бюракратызацыі прафсаюзаў, камсамола і іншых грамадскіх арганізацый ва ўмовах планавання адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Вытокі негатыўных з'яў у партыйным

жыцці. Умацненне кантролю наменклатуры за грамадскім жыццём. Умацаванне пазіцый бюракратыі.

Асаблівасці развіцця культуры, навукі, адукацыі ў Беларусі ў канцы 70-х—пачатку 80-х гадоў. Развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы навукі, культуры, адукацыі. Становішча ў народнай адукацыі. Прычыны недастатковай сацыяльнай эфектыўнасці павышэння адукацыйнага ўзроўню насельніцтва. Развіццё беларускай навукі. Мастацкая літаратура. Раман як вядучы жанр у беларускай літаратуры. Тэатр. Мастацкая самадзейнасць. Народная творчасць.

Барацьба абнаўленчай і ахоўнай тэндэнцый у духоўным жыцці рэспублікі. Незавершанасць працэсу дэмакратызацыі грамадскага жыцця і яго ўплыў на развіццё беларускай мовы, навукі і асветы. Узмацненне ідэалагічнага дыктату ў духоўным жыцці грамадства. Прычыны духоўнага крызісу грамадства і яго вынікі.

Павышэнне актыўнасці БССР у ААН. Меры, якія прымаліся рэспублікай па ўмацаванню міру, міжнароднай бяспекі, разбраенні. Пашырэнне гандлю і абмену навукова-тэхнічнымі дасягненнямі з замежнымі краінамі ў 60-х (першай палове 80-х гадоў. Культурныя замежныя сувязі рэспублікі.

## ТЭМА XII. БЕЛАРУСЬ НА ШЛЯХУ ДЗЯРЖАЎНАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ. УТВАРЭННЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сацыяльна-эканамічнае становішча. Палітыка партыйных і дзяржаўных органаў у эканамічнай сферы. Цяжкасці ажыццяўлення эканамічных рэформ ў рэспубліцы. Спробы перавода прадпрыемстваў, аб'яднанняў на гаспадарчы разлік і самафінансаванне. Цяжкасці пераходнага перыяду. Разбалансаванасць народнай гаспадаркі. Прычыны падзення аб'ёмаў прадукцыі прамысловай вытворчасці ў 1990—1992 гг. Выпрацоўка новай аграрнай палітыкі ў рэспубліцы. Супраціўленне усталяванню розных форм маёмасці і гаспадарання на зямлі. Прычыны падзення жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Чарнобыльская аварыя. Праграма ліквідацыі яе вынікаў. Сацыяльна-эканамічныя праблемы ва ўмовах пераходнага перыяду і шляхі выхаду эканомікі з крызісу.

Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця рэспублікі. Новы спектр грамадска-палітычных сіл ва ўмовах узрастання крызісных з'яў. Зараджэнне нефармальных аб'яднанняў як адна з праяў крызісу аднапартыйнай сістэмы. Узнікненне БНФ. Аслабленне пазіцый КПБ і зніжэнне яе ўплыву ў палітычным жыцці рэспублікі. Палітычная платформа і дзейнасць фракцый у Вярхоўным Савеце. Узнікненне новых палітычных партый, рухаў. Іх дзейнасць. Жнівеньскі (1991 г.) путч і яго уплыў на палітычныя з'явы на Беларусі. Прыпыненне дзейнасці КПБ—КПСС і нацыяналізацыя партыйнай маёмасці. Адхіленне КПБ—КПСС ад улады. Прафсаюзы. Супярэчлівы працэс фарміравання рэальнага палітычнага плюралізму.



Прыняцце Вярхоўным Саветам БССР 27 ліпеня 1990 г. Дэкларацыі аб Дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР. Наданне Дэкларацыі статуса Канстытуцыйнага закону 25 жніўня 1991 г. Закон БССР аб назве рэспублікі. Удзел Рэспублікі Беларусь у распрацоўцы Дагавору аб Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Устанаўленне інстытута прэзідэнтства. Выбранне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Асноўныя напрамкі пашырэння эканамічнай інтэграцыі з Расіяй і іншымі дзяржавамі СНД. Дагавор аб палітычнай бяспецы дзяржаў СНД. Народнае волявыяўленне на рэферэндуме 1995 і 1996 гадоў. Утварэнне саюза Беларусі і Расіі.

Праграма адраджэння беларускай мовы. Наданне беларускай мове статуса дзяржаўнай мовы РБ. Пашырэнне сеткі беларускіх школ у гарадах рэспублікі. Закон аб адукацыі. Вышэйшая і сярэдняя спецыяльная адукацыя: новыя тэндэнцыі ў яе развіцці. Дзейнасць АНБ ва ўмовах пераходнага перыяду. Асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў. Перабудова ў сферы гуманітарных навук. Уплыў дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця на рост нацыянальнай свядомасці грамадства. Рост цікавасці да беларускай культуры, гісторыі. Дзейнасць Беларускага фонда культуры, Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны і самадзейных арганізацый па пашырэнні ўжывання беларускай мовы ў рэспубліцы. Экалагічны рух. Праблемы аховы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Творчыя арганізацыі рэспублікі і іх уклад у працэс абнаўлення грамадства. Дасягненні і супярэчнасці ў ходзе нацыянальна-культурнага адраджэння беларускага народа.

Міжнародныя сувязі Беларусі. Пашырэнне эканамічных сувязяў Беларусі з замежнымі дзяржавамі. Новыя формы знешнеэканамічных і навуковых сувязяў рэспублікі з замежнымі краінамі. Закон "Аб асновах знешнеэканамічнай дзейнасці Беларускай ССР". Формы культурных сувязяў з замежнымі краінамі. Рэспубліка Беларусь і яе роля ў развіцці міжнародных сувязяў. Прызнанне замежнымі дзяржавамі незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Цяжкасці і складанасці эканамічных рэформ у 1992—1996 гг. Пошук шляхоў сацыяльна-эканамічнай абароны насельніцтва.

Змяненні духоўнага жыцця беларускага народа ў канцы 80-х (пачатку 90-х гадоў. Нацыянальна-культурнае і духоўнае адраджэнне ў Беларусі. Станаўленне сістэмы нацыянальнай адукацыі. Навука, літаратура і мастацтва Беларусі на сучасным этапе.